# ЛУКАШЭНКА Аляксандр Рыгоравіч



Нарадзіўся 30 жніўня 1954 г. у гарадскім пасёлку Копысь Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Беларус.

Закончыў дзве навучальныя ўстановы: у 1975 г. — Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова, у 1985 г. — Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Гісторык, эканаміст.

У 1975—1977 гг. служыў у пагранічных войсках, у 1980—1982 гг. — у Савецкай Арміі.

Пасля армейскай службы А.Р.Лукашэнка працаваў у камсамольскіх і партыйных органах, займаў пасады намесніка і кіраўніка прадпрыемстваў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і аграпрамысловага комплексу БССР.

У 1990 г. выбіраецца ў Вярхоўны Савет БССР.

10 ліпеня 1994 г. А.Р.Лукашэнка быў выбраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (атрымаў больш за 80 % галасоў выбаршчыкаў).

У верасні 2001 г. пераважнай большасцю галасоў (75,65 %) выбраны паўторна Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у сакавіку 2006 г. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, які набраў 83 % галасоў выбаршчыкаў, атрымаў упэўненую перамогу і быў перавыбраны на пасаду Кіраўніка беларускай дзяржавы.

А.Р.Лукашэнка — бацька трох сыноў.